Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

РЭХА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата ганарування залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 6 — Вільня, Серада 19-га верасьня 1928 г. — Год 1

На ўласныя ногі.

Хто чытаў беларускую радыкальную прэсу, той мусіў заўважыць яе сталае цьверджаньне, што чужая, панская ласка нам нічога ня дасьць і што адзіны шлях вызваленьня з таго нявыноснага палажэньня, у якім знаходзімся, ляжыць толькі ў нашай уласнай самадзейнасьці, толькі ў веры ў свае ўласныя сілы.

Пара пераходзіць ад слоў да дзела.

Для ўсіх ясна, што прычынай нашага дрэннага палажэньня, поруч з цяжкімі падаткамі, ёсьць вызыск нас капіталістымі праз гандаль. Пры прадажы навет найменшае меркі бульбы, ці пуда жыта, якія мы мусім прадаць, каб заплаціць тыя самыя падаткі, ці зрабіць тыя направы ў гаспадарцы і ў сваім уласным жыцьці, бяз якіх ня можам абыйсьціся,—гандляр нам не даплачвае. Калі мы купляем тавар, то купляем не па той цане, па якой выходзіць ён з фабрыкі, а з значнаю надбаўкаю ў бок гандляра.

Ня шмат мы прадаем, бо ня маем чаго, ня шмат і купляем, бо ня маем за што, але ёсьць і ў нашым жыцьці рэчы, бяз якіх ня можам абыйсьціся. Мы мусім прадаць і купіць. А ў тым і ў другім выпадку нас вызыскваюць. Здавалася-б, што пры нашай беднасьці няма чым з нас пажывіцца. Аднак, калі паглядзім кругом, то бачым цэлыя хмары гандляроў, купцоў. З чаго яны жывуць? Жывуць з тае прыбылі, якую атрымоўваюць праз танънейшую куплю і даражэйшую прадажу, жывуць з вызыску нас, сялян і работнікаў... Ці вырабляюць яны, як гаворыцца, новыя вартасьці, прадукты? Не! Вырабляюць іх толькі нашы сялянскія ці работніцкія мазольныя рукі. На іх усё дзержыцца. А заплата за гэта? Голад і холад. Заплата ідзе ў рукі „вышэйшых", нерадукцыйных клясаў, якія не вырабляюць ніякіх вартасьцяў.

Поруч з шляхам беспасярэдняй палітычнай барацьбы сялян і работнікаў, барацьбы з вызыскам, а разам барацьбы за палепшаньне нявыноснага палажэньня існуе і іншы шлях барацьбы,—арганізованая барацьба на гаспадарчым груньце. *Гэта—шлях каапэрацыі.*

Каапэратары кажуць, што каапэрацыя ёсьць адзіны шлях, як да палепшаньня свайго палажэньня, гэтак і да зьмены ўсяе сыстэмы, парадку кіраваньня грамадзкім жыцьцём, ёсьць адзіны шлях да паступовае замены капіталістычнага ладу новым—сацыялістычным. Мы зусім згаджаемся з гэтым цьверджаньнем, мы верым больш у беспасярэднюю палітычную барацьбу — з усім, што нас цісьне, што прыводзіць яшчэ да горшага палажэньня, як ёсьць, але прызнаём, што запраўды *каапэрацыя ёсьць адзін з магутных спосабаў барацьбы з вызыскам, барацьбы, прыводзячай, поруч з другімі шляхамі, і да зьмены існуючага ладу.*

Трэба арганізоўваць сваю беларускую сялянска-работніцкую каапэрацыю. Няхай у кожнай вёсцы, заместа крамкі гандляра, будзе агульная крама, крама каапэратыўная. Няхай хоць невялікія грошы з нашай куплі-прадажы пойдуць ня ў рукі гандляроў, а астануцца ў нас, у нашай агульнай краме. Яны будуць нашым грамадзкім, сялянска-работніцкім капіталам.

Бязумоўна, адным заклікам мы ня зробім яшчэ каапэрацыі, каапэрацыя патрабуе веды, якую мы можам даведацца з кніжак аб каапэрацыі, з вуснаў людзей, знаёмых з каапэрацыяй і г. д., каб зразу-ж не апынуцца з пустымі рукамі. Наша задача—паказаць гэты шлях барацьбы, паказаць адзін з тых выхадаў, які можа быць знойдзены для нашай творчай энэргіі пры немагчымасьці праявіць яе іншым спосабам.

Магчыма, што тыя пробы каапэрацыі, якія былі роблены, пробы няўдачныя, ставяць нас перад цяжкаю задачаю пераканаць нас саміх у пасьпех справы. Але ў нашы часы ня падае сама манна з неба. Толькі тое, што можна здабыць упорнай барацьбой, ёсьць трывалае. Прыступайма да каапэрацыі! Няхай не марнуюцца тыя сілы ў вёсцы, якія ня можна праявіць іншым спосабам. Пачынайма каапэрацыю зьнізу, гэта будзе наша каапэрацыя!

Станавемся на свае ўласныя ногі! *).

*) Першыя парады аб залажэньні каапэратыва можна знайсьці ў кніжачцы М. Манцэвіча: „Як залажыць каапэратыў", якую можна выпісаць з усіх беларускіх кнігарняў.

Жэнэўская канфэрэнцыя у справе акупацыі Надрэніі.

Нязвыкла вострая прамова Брыяна проці Нямеччыны не перашкодзіла немцам настаяць на тым, каб у Жэнэве адбылася канфэрэнцыя 5 дзяржаваў, беспасрэдня заінтарэсаваных у справе акупацыі Надрэніі.

Цікаўна, што першая канфэрэнцыя адбылася 11. 9, ці—зараз жа—назаўтра—пасьля гэтай няруковай прамовы Брыяна. З гэтага ўжо відаць, што самая прамова Брыяна была ў значнай меры спрытным „тактычным крокам", які меў мэтай уплынуць згары на нямецкую дэлегацыю: пастрашыць яе няўступлівасьцяй Францыі дый зьбіць згары ўжо „залішнія трэбаваньні" нямецкага ўраду ў спорнай справе. Так больш-менш і тлумачаць лоўкі манэўр Брыяна некаторыя нямецкія і навет францускія газэты. Але, апрача гэтай „тактыкі", — была, зразумела, і „шчырасьць" у абурэньні Брыяна. Справа ў тым, што як ні-як усё бліжэй падыходзіць час, калі прыйдзецца скасаваць акупацыю, — выпусьціць з рукаў прылад, які дае Францыі такую нябывалую сілу над сільнейшай нераўнуючы Нямеччынай, забясьпечваючы тым Францыі бязумоўную дыктатуру на эўрапэйскім Матэрыку. Усё менш і менш астаецца ў руках Францыі праўных, маральных і рэчова палітычных давадаў падтрымліваць усьцяж такі надзвычайны стан у Эўропе, нарушаючы ўсе прынцыпы міжнароднай роўнасьці і волі дзяржаваў дый яшчэ і сябраў адной Лігі!..

З другога боку, ніхто лепш, як Францыя не разумее ўсьцяж узрастаючай сілы Нямеччыны ў-ва ўсіх галінах дзяржаўнага разьвіцьця яе народу. Нямецкі народ усьцяж —усё сільней і магутней—націскае на свой урад, каб скінуў урэшце з яго карка нязноснае ганебнае і каштоўнае іга чужаземнай акупацыі...

Яркім выражэньнем „гнеўнага страху" Францыі перад гэтай нямецкай сілай і зьяўляецца „гістарычная" прамова Брыяна.

Запраўды-ж, ці-ж можа быць нешта больш недарэчнае дый абураючае, як закідаць нямецкаму народу, як „незаконныя збраеньні", „вялізарную масу ў краі сільных здаровых мужчын" дый—„высокі стан яго прамысловасьці"!?! Што з „масы сільных мужчын" можна зрабіць добрую армію, гэта—бясспрэчна. Што „высокая прамысловасьць" — найлепшы казыр народу ў сучаснай вайне— таксама бясспорна.

Але на гэта ўжо няма рады: у гэтым— выраз грунтоўнай, істотнай перавагі—фізычнай і гаспадарчай—аднаго народу над другім, перавагі, якая так, ці інакш, вырашыць урэшце справу іх мірнай ці нямірнай барацьбы і канкурэнцыі ў сьвеце... Дык іншая рэч — дамагацца, каб „мірная прамысловасьць", мірныя шляхі і способы канкурэнцыі—няператвараліся на ваенныя: дзеля гэтага і трэба шукаць мірных шляхаў паразуменьня ў спрэчных справах, як гэта і рабілі ў апошнія гады сам Брыян з Штрэзэманам. Але трэбаваць—„спыненьня"... „сільных мужчын" ў краі канкурэнта ды „прыпыненьня" развіцьця яго небясьпечнай канкурэнту прамысловасьці, інакш, пагражаючы неабмяжаваным утрыманьнем ваеннай акупацыі, гэта—запраўды-ж нячуваная рэч!

З Прамовы Брыяна—ясна, што ён хоча запраўды-ж неабмяжавана даўгі час як быццам зраўнаважваць фізычныя, гаспадарчыя і ўсялякія іншыя перавагі Нямеччыны над Францыяй—чыста ваеннымі мерамі—ваеннай акупацыяй нямецкай зямлі францускім войскам! Дык—пытаньне, з чыяго боку тутака маем шкодны для культуры і гаспадаркі сьвету мілітарызм — з нямецкага ці францускага!..

Асабліва абурыла Брыяна, як сьцьвярджаюць газэты, пляновая кампанія Нямеччыны ў справе роўнага разбраеньня ўсіх дзяржаваў. Запраўды-ж — побач з выступленьнем старшыні нямецкай дэлегацыі — адзін па адным дэлегаты „дзяржаваў нямецкай групы" ў Лізе Нацыяў — п. п. Мотта (Швайцарыя), Ундэн (Швэцыя), Мовінкэль (Нарвэгія), Блоклэнд (Данія), Зайпэль (Аўстрыя)—быццам у „злосным паразуменьні" з Нямеччынай (так запраўды і думае карэсп. „Кур. Варш."!!!)—выступілі — страшэнна падумаць!—з трэбаваньнем „агульнага разбраеньня"!.. і гэта—у той час, калі „надставай палітыкі саюзьнікаў" у Эўропе зьяўляецца разбраеньне... толькі аднэй Нямеччыны (Вэрсальскі Трактат)!!. Калі-ж пасьля ўсіх гэтых „правакацыйных прамоваў з боку дэлегатаў „філянямецкіх дзяржаваў" выступіў канцлер Мюллер з тым-жа дамаганьнем, і пачаў біць азброеных да зубоў саюзьнікаў іх-жа ўласным „Вэрсальскім Трактатам", зацытаваўшы адтуль сьцяг артыкулаў, якія кажуць, што разбраеньне Нямеччыны Трактат матывуе, як першы крок і варунак агульнага разбраеньня!..

Вось гэты шляхотны „агульны прынцып" і „матыў" Ч. 5-ай „Трактату, разьдзеўшы нямецкі народ дагола перад азброеннымі да зубоў саюзьнікамі:

Каб умагчыміць падрыхтаваньне агульнага (!) абмяжаваньня збраеньняў усіх (!) народаў, Нямеччына абавязваецца выканаць далей паданыя правіла (разбраеньня).

Трэба сьцьвердзіць, што канцлер Мюллер, якраз папаў у самае праўна і маральна слабае і балючае мейсца саюзьнікаў, а перадусім—Францыі: ён патрэбаваў, каб самі саюзьнікі, накінуўшыя Нямеччыне Трактат,— таксама выконвалі яго, як вымагаюць гэтага ад Нямеччыны! Але-ж—зразумела,—атрымаўшы шляхам разбраеньня Нямеччыны такую палітычную перавагу над ей, што могуць усьцяж і надалей дыктаваць ёй сваю волю, саюзьнікі нялёгка зракуцца гэтае карыснае ім з усялякіх бакоў прывілегіі. Што барацьба за ўтрыманьне гэтых прывілегіяў, гэтай штучнай перавагі над Нямеччынай, здабытых Францыяй больш, як напалову, чужымі рукамі (Расеі і Амэрыкі...) пачнецца на нашых вачох у нячувана драматычнай (добра яшчэ—калі ня ў якой... вастрэйшай!) форме,—вось аб гэтым і кажа нам гістарычная прамова Брыяна. У гэтым і зьмяшчаецца запраўды-ж вялізарнае значэньне і вялікая цікаўнасьць гэтай прамовы.

За абмяжаваньне ці скасаваньне акупацыі — Саюзьнікі трэбуюць ад Нямеччыны новых „кампэнсацыяў" ды „гарантыяў". Якія гэта кампэнсацыі, дакладна няведама: ані францускі ані нямецкі ўрад не падалі, „зразумела", сваіх прапазіцыяў да агульнага ведама. Але гандаль ужо распачаты, здаецца навет афіцыяльна.

Прэса з абодвух бакоў падае чуткі аб гэтых „кампэнсацыях"—ці варунках, на якіх саюзьнікі згадзіліся-б выпусьціць з рук тую „сякеру", якую яны трымаюць усьцяж на карку нямецкага народу, каб усьцяж каманд
даваць яго ўрадамі — у сваіх мэтах і карысьцях — коштам нямецкага народу.

Але прэса неяк „даведалася", быццам Брыян на першым пасяджэньні канфэрэнцыі ў справе акупацыі так сфармуляваў францускія варункі скасаваньня — перад трактатавым тэрмінам — акупацыі...

За гэты першы крок на шляху абмяжаваньня сваіх збраеньняў, даючых ім неапраўданую ніякімі агульна зразумелымі матывамі штучную перавагу над разброенай Нямеччынай.

1. Стварэньне „канстытуцыйна-паразумяваўчага камітэту" — з правамі палюбоўнага суду, — зложанага з прадстаўнікаў заінтэрэсаваных дзяржаваў (здаецца і Японіі!!!), — з учасьцем, зразумела, і Нямеччыны. Камітэт мае разьбіраць і вырашаць усе спрэчкі і скаргі на тэрыторыі дэмілітарызаванага паса (Надрэніі пасьля выхаду з яе саюзьніцкіх войскаў. Камітэт быццам „ня меў-бы характару кантрольнага(?) органа", але меў-бы мэтай толькі загарантаваць Францыі яе бясьпечнасьць: Францыя хоча мець пэўнасьць, што гэты пас запраўды астанецца нэйтральным), ня будзе выкарыстаны Нямеччынай для ваенных мэтаў.

2. Стварэньне сталай камісіі рэчазнаўцаў, якая-б безадкладна занялася справай новага ўрэгуляваньня справы адшкадаваньняў — новых фінансава-гаспадарчых кампэнсацыяў з боку Нямеччыны на карысьць Францыі. Нямеччына мела-б згары заплаціць адразу значную суму з усяго адшкадаваўчага доўгу Францыі, каб тая магла сплаціць частку свайго ваеннага доўгу Амэрыцы. Але частка францускай прэсы ідзе яшчэ далей і прыпісвае Брыяну яшчэ дадатковыя трэбаваньні, якія быццам Францыя выстаўляе, як „мінімальныя" (найменшыя, канчальныя)?! Такім чынам — трэцім варункам Францыі зьяўляецца — адмова з боку Нямеччыны ад усялякіх „пакушэньняў на палітычную незалежнасьць Аўстрыі" (адмова ад „Аншлюсу" — злучэньня), пакідаючы Нямеччыне неабмяжаванае права гаспадарчых умоваў з Аўстрыяй.

3. Пашырэньне „Лёкарнскіх прынцыпаў на ўсходнія граніцы Нямеччыны, ці — такое ж канчальнае прызнаньне непарушнасьці польска-нямецкіх граніцаў, якое падпісала Нямеччына ў Лёкарно адносна сваіх Рэйнскіх граніц. (Так зван. „Усходняе Лёкарно").

Нямецкая прэса дае сьцяг падробнасьцяў у гэтых „варунках Францыі". Як ведама, Францыя зрабіла ўжо важную ўступку нямецкаму пункту гледжаньня, які цалком выключаў з перагавораў у справе акупацыі Польшчу і Чэха-Славакію, як не заінтэрэсаваныя беспасрэдна ў „справе Рэйну" дзяржавы.

Дзеля таго, калі 12 чэрвеня мін Залескі на банкеце у Парыжу ў вялікай палітычнай прамове патрэбаваў, каб у справе скасаваньня акупацыі Надрэніі быў выслуханы і голас Польшчы, яму ня даў на гэта водгука ніводны з быўшых на банкеце францускіх дзяржаўнікаў. А афіцыёз францускага ўраду „Тан" у сьцягу перадавіц перад самай сэсіяй Лігі ясна заявіў, што „справа акупацыі датычыць усіх саюзьнікаў... прымаючых сваімі войскамі ўчасьце ў акупацыі"... Гэтым Францыя дала выразны адказ на прамову мін. Залескага 12 чэрвеня.

Але недарма-ж у Жэнэве кажуць, быццам вострая прамова Брыяна — „рэзультат пэўнага ўплыву" на яго з боку мін. Залескага. Бо-ж у „новых варунках" Францыя дае, як кампраміс з Польшчай і Чэха-Славакіяй, пэўны голас у справе і гэтым „Лёкарнскім" дзяржавам. А іменна, — хаця ў „паразумяваўчым камітэце" ня дадзена мейсца дэлегатам Польшчы і Чэха-Славакіі, але ўсё-ж праект прызнае і гэтым дзяржавам права ўносіць у камітэт скаргі, калі яны ўгледзілі-б у „Рэйнскім нэйтральным пасе", ці дзе інш(!) якія „непакоючыя зьявішчы"...

Што мы запраўды маем перад сабой „францускія варункі" скасаваньня ці рашучага зьменшаньня акупацыі, кажа тое, што нямецкая прэса вельмі павагна аднеслася да гэтых вестак францускай прэсы. Трэба толькі дадаць, што калі гэтыя варункі пушчаны запраўды ў прэсу самім Брыянам, дык пэўне-ж яны, як пробны шар, пушчаны не як мінімальныя (найменшыя — канчальныя), але—як максымальныя—найвялікшыя— з такім „гандлёвым запросам", які дасьць магчымасьць пасьля, таргуючыся з немцамі, — „спускаць" значна цану. Бо-ж згары добра ведама Брыяну, што Нямеччына ніколі ня згодзіцца — адмовіцца ад „дадатковай забароны" (апрача ўказанай у Вэрсальскім Трактаце), цясьнейшай сувязі з Аўстрыяй (як гэта сьцьвердзіў у сваей прамове канцлер Мюллер); ня згодзіцца і прызнаць канчальнымі свае граніцы з Польшчай, на міры перагляд якіх дае ей бясспрэчнае права той-жа Вэрсальскі Трактат. Гэта таксама выразна сьцьвердзілі неаднойча нямецкія адказныя дзяржаўнікі.

Такім чынам, астаюцца магчымымі да дыскусіі—справа фінансавых кампэнсацыяў і канкрэтных гарантыяў нэйтральнасьці „Рэйнскага паса". Трэба думаць, што якраз на гэтым абмяжаваным тэрэне і будуць весьціся перагаворы.

—•—

Падрыхтаваўшы „артылерыйскім агнём" ці „гусарскай атакай" пачаўшуюся доўгую кампанію, але, трэба думаць, не настрашыўшы німала Нямеччыну, Брыян пачне больш спакойна і рэчова гутарыць, бароначы інтарэсы Францыі дый стараючыся „сарваць" з немцаў усё, што толькі... тыя дазволяць.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Зьмена Канстытуцыі.

Як падае „Rzeczpospolita“ (264), у наступным месяцы ўрад мае разглядзець праект зьмены канстытуцыі, апрацаваны ўрадавай партыяй. Чакаюць толькі прыезду Пілсудскага з Румыніі, без якога „ўсякія зьмены“ цяпер, як ведама, у Польшчы ня робяцца.

Гадаўшчына niepodległości Польшчы.

10-га кастрычніка выпадае гадаўшчына незалежнасьці Польшчы. У зьвязку з гэтым ужо цяпер рыхтуюцца ўрадавыя колы да ўрачыстага абходу гэтай гадаўшчыны. Міністар асьветы выдаў распараджэньне, якім звальняе школьнікаў ад занятак 10-га кастрычніка. Творацца ваяводзкія і павятовыя камітэты, дзеля арганізацыі гэтага сьвята. Чаго, чаго, а музыкі „Jesze polska nie zginęła“... наслухаюцца ў гэтую гадаўшчыну навет і за кратамі!

Зьезд ваяводаў.

17-га гэтага месяца ў Варшаве адбыўся зьезд ваяводаў з усей Польшчы, на якім быў прысутны „сам“ прэм'ер Бартэль. Як падаюць газэты, на гэтым сабраньні абгаварвалі аправізацыйную (прадавольственную) палітыку ўраду.

Але, пэўне-ж, пры гэтым былі закрануты і больш „pałące“ пытаньні, асабліва нашымі „крэсовымі“ ваяводамі.

Дымісія Лізарава.

Як падаюць польскія газэты, таргровы прадстаўнік ССРР Лізараў, на жыцьцё якога ня так даўно пакушаўся расейскі манархіст, падаўся ў адстаўку. Заступнік на яго мейсца пакуль-што яшчэ ня вызначаны Савецкай уладай.

Зьверненыя дакументы.

Польскі дзяржаўны архіў перадаў скарбоваму архіву зьверненыя з ССРР зямельныя акты і дакуманты. Гэтыя акты будуць перададзены Міністэрству Зямельных Рэформаў і земскім камісіям дзеля выкарыстаньня і рукаводзтва пры правядзеньні камасацыі і ліквідацыі сэрвітутаў. Асабліва яны будуць важны ў выпадках, калі між старонамі (абшарнікамі і сялянамі) паўстае спрэчка аб граніцах і сэрвітутах.

Змаганьне проці капіталістычнай рацыяналізацыі працы.

Як ведама, частковая стабілізацыя польскай прамысловасьці была зроблена пры помачы гэтак званай капіталістычнай рацыяналізацыі працы, якая кіруецца такімі прынцыпамі: „рэарганізаваць“ абслугу, г. зн. выкінуць „непатрэбных“ работнікаў, а пакінуць як найменш і на іх узваліць усю працу, (адгэтуль безрабоцьце) і ўжо з гэтых застаўшыхся выцягнуць як найбольш сокаў і як найменш заплаціць. Апроч таго, пушчаецца ў хутчэйшы—як найбольшы — рух машыны, замест абслугоўваньня аднэй машыны, прымушаецца працаваць пры двух ці трох (прадзільныя варштаты), пры тым за аднолькавую плату; адбіраюцца або моцна агранічваюцца сацыяльныя здабычы, як платныя водпускі і інш., забараняюцца рабочыя арганізацыі (скасаваньне фабр. камітэтаў, дэлегацыяў). Вось „дабрадзействы“ кап. рацыяналізацыі працы! Дзякуючы нялюдзкаму вызыску рабочых, і праводзіцца гэта „стабілізацыя“.

Ня дзіва, што рабочыя вядуць проці яе заядлую барацьбу.

Вынікі „рацыяналізацыі“.

У горадзе Олькушу 9/IX с. г. адбылося сабраньне работнікаў фабр. „Olkusz“, на якім прамоўцы сьцьвердзілі, што палажэньне работнікаў значна пагоршылася навет проціў леташняга году: фабрыканты зьменшылі заробкі, самавольна ўрэзалі плату за здзельную працу і скасавалі шмат сацыяльных здабыткаў, якіх раней дабіліся работнікі.

Пасьля мітынгу дырэкцыя зволніла 60 больш упартых і энэргічных работнікаў, якія працавалі па 10—15 гадоў на гэтай фабрыцы.

У зьвязку з гэтым спадзяюцца агульнай забастоўкі мэталёўцаў горада Олькуша.

Забастоўкі.

Лодзкія ткачы фабрыкі Зільбэрштэйна ў ліку 400 чал. 13/IX г. м. пачалі забастоўку з тае прычыны, што адміністрацыя выдала новае распараджэньне, паводле якога работнікі падлягалі-б суровым карам і розным штрафам за ўсялякае глупства.

У Красьне работнікі шкляной гуты, у ліку ста чалавек, абвясьцілі забастоўку, дамагаючыся павышэньня заробкаў.

У Беластоку ўжо ад 1-га верасьня бастуюць пекары. Прычына забастоўкі — ламаньне прадпрыёмцамі 8-мі гадзіннага дня працы і кепскія заробкі пекараў. На канфэрэнцыі ўласьнікі пякарняў згаджаліся ўвясьці 8-мі гадзінны дзень працы, але адначасна хочуць абнізіць заработную плату, на што работнікі не маглі згадзіцца і пастанавілі змагацца да поўнай перамогі.

Рыхтуюцца да забастоўкі.

Саюз работнікаў Прадзільнага Промыслу, сарваўшы ўмову з фабрыкантамі, пачаў ладжаньне масавых сабраньняў-мітынгаў з мэтай падрыхтаваць работнікаў да агульнай забастоўкі. 19 г. м. адбудзецца сабраньне фабр. дэлегатаў, якія маюць абгаварыць гэту справу і назначыць дзень для пачатку забастоўкі.

Працэс у Вайсковым Судзе.

Як падае „Głos Prawdy“ з дня 11-IX (№ 252) 10-IX у Варшаўскім Вайсковым Акружным Судзе пачаўся працэс проціў капітана Т. Флёрэнцкага, капіт. рэзэрвы Вітальда Вальзэра і паручніка Якуба Левандоўскага, якія абвінавачваюцца ў цэлай чарзе ашуканчых махінацыяў („nadużyć“). Два першыя абвінавачваюцца ў тым, што выставілі фальшывы рахунак на 29 тыс., быццам заплочаных за кружкі да дымавых сьвечак, далей што пазвалялі на тэрыторыі крэпасьці легіёнаў пасьвіць цывільным асобам быдла, ад якіх за гэта атрымалі падарак па карове кожны, і за тое, што пансавалі пры ўрадавай касе пячаць і шнурок, каб укінуць туды пакет з грашыма, перад рэвізіяй касы дзеля пакрыцьця недахопу скарбовых грошы, які яны раней пастараліся зрабіць; пазвалялі работнікам, аплачваным праз Мін. Вайсковых Спраў, праваціць электрычнасьць для прыватнай фірмы „Granat“ і пры гэтым ужывалі скарбовы матар'ял; аддавалі ў арэнду дзяржаўную зямлю, секлі лес і грошы хавалі сабе ў кішэні, даючы толькі невялікія хабары сваім падуладным. Удадатак Клёрэнцкаму робяцца закіды, што ён краў (przywłaszczał) для сябе скарбовы вугаль, вымушаў ад дастаўцаў хабароў. Вальзэру—тое самае і тое, што ён прыказаў жаўнеру сачыць па горадзе за аднэй пекнай кабетай, што ён мусіў выконваць у працягу 8-мі дзён — цэлая літанія! Як відаць, дык „санацыя“ пусьціла такі свае карані і ў войску і гэта-ж толькі адна выкрытая справа, а колькі ёсьць гэтых самых „nadużyć“, дзе яны сходзяць чыста-гладка?

Цікава, што гэтыя „капітаны“, нарабіўшыя столькі стратаў і подласьцяў, адказваюць з вольнасьці, у той час, калі за адно толькі „падазрэньне“ трымаюць сотні людзей да суду па году і больш у вастрогах. Цікава, які прыгавар вынясе суд у гэтай справе, ці асудзіць на 12-ць гадоў, ці не?

І судовы каморнік „дэфраўдуе“.

Польская газэта („Rzeczpospolita“) падае, што судовы каморнік пры Тчэўскім павятовым судзе — Каспэрскі, забраўшы вялікую суму грошы, уцёк няведама куды. Колькі ён захапіў — добра яшчэ ня ведаюць, але ў адным толькі выпадку сьцьверджана прэнажа 5-цёх тысячаў. Пракурор разаслаў гончыя лісты, але сумліўна, ці дагоняць яны Каспэрскага!

Забойца — апраўданы.

Паводле інфармацыі газэты „Głos Prawdy“, 13-IX Суд Апэляцыйны ў Варшаве разглядаў справу дамаўласьніка з Сасноўца Аляксандра Кавальчыка, які забіў выстрэлам з рэвальвэру работніка Крыжаноўскага.

Высьвяецца, што Кавальчыка многія падазравалі ў тым, што ён зьяўляецца канфідэнтам і, калі адзін раз ішоў на вуліцы, на яго напала некалькі асоб і адзін з іх быццам намераваўся ўдарыць канфідэнта шабляй па галаве. Выстрэліўшы два разы ў паветра, Кавальчык нацэліў у жывот Крыжаноўскага і палажыў трупам на мейсцы.

Суд Апэляцыйны, прызнаўшы, што гэта забойства зьяўлялася неабходнай самаабаронай — Кавальчыка апраўдаў — зацьвярдзіў такі-ж самы прыгавар Акружнага Суду ў Сасноўцу.

А вось у той самы дзень і ў той-жа Варшаве Акружны Суд засудзіў нейкага Ношчыка на 4 гады цяжкага вастрогу толькі за тое, што той, уцякаючы ад вывядоўца, стрэліў у яго.

Каментарыяў не падаем...

За брашуры „Вайна вайне“ тры гады „папраўчага“ дому

13-IX Суд Апэляцыйны ў Варшаве зьменшыў, пасьля энэргічнай абароны адваката Дурача, кару Мотэлю Кармазыну з 4 гадоў вастрогу на тры гады папраўчага дому.

М. Кармазын абвінавачваецца ў тым, што належыць да камуністычнай партыі, што быццам сьцьверджана тым, што яго паліцыя злавіла на вуліцы і знайшла ў кішанёх некалькі экзэмпляраў камуністычнай брашуры „Вайна вайне“.

Лёс работніка.

На станцыі Горкавічы, каля Петракова, задаўлены цягнікам сцэпшчык Грымала. Цела няшчаснага некалькі дзён ляжала на станцыі непахаванае, бо-ж ён, відаць, ня меў радні. Варшаўская і катавіцкая дырэкцыі ні адна ні другая не хацелі хаваць—спрачаліся, бо-ж, бачыце, гэты няшчасны выпадак здарыўся як-раз на граніцы гэтых дырэкцыяў. Катавіцкая дырэкцыя піша да варшаўскай, каб яна пахавала, а варшаўская — тое самае да катавіцкай і ня ведама, мусіць, цела нябожчыка так і згніло-б, пакуль паны кіраўнікі спрачаліся-б, але такое палажэньне вельмі абурыла грамадзянства і прымусіла такі мясцовага ксяндза сабраць сярод прыхаджан ахвяры, зрабіць труну і пахаваць.

Вось, які лёс і якое адносіньне да „чорна-работніка“, які і жыцьцё сваё палажыў на працы! Каб гэтак здарылася-б з якім „белым“—панам кіраўніком, дык пэўне дырэкцыі не спрачаліся-б доўга.

Таямнічы стрэл.

„Rzeczpospolita“ (№ 262) падае, што ў Віляноўскім лесе нейкі злачынца выстраліў з рэвальвэру ў практыканта — лясьнічага Юрыя Звалінскага, падчас, калі ён прысеў на пень ў Залеўскім (пав. Груецкі) лесе. Куля папала якраз у гадзіньнік, які быў у бакавой кішэні практыканта і, дзякуючы гэтаму, Звалінскага навет ня раніла. Відаць, што гэты практыкант добра даўся ў знакі.

Заграніцай.

Канфэрэнцыя ў справе акупацыі Надрэніі.

Нямецкая і француская прэса паведамляюць, быццам канфэрэнцыя дэлегатаў акупацыйных дзяржаваў — у справе эвакуацыі Надрэніі мае адбыцца ў канцы верасьня або ў пачатку кастрычніка. Быццам Брыян настаівае на тым, каб у канфэрэнцыі прынялі ўчасьце асабіста Чэмбэрлен і Штрэзэман. У канфэрэнцыі мае прыняць учасьце, апроч дэлегатаў Нямеччыны, Англіі, Францыі, Італіі, і прадстаўнік Амэрыкі—у характары наглядчыка. А гэта—дзеля таго, што Брыян за ўсялякую цану хоча—ня толькі змусіць Нямеччыну да значных фінансавых ахвяраў за перадчасовае скасаваньне акупацыі, але і зьвязаць з гэтым справу міжсаюзніцкіх даўгоў, якая ў вялікай меры залежыць ад Амэрыкі.

Адказ нямецкага канцлера на прамову Брыяна—ў гутарцы з журналістамі.

Нямецкая дэлегацыя быццам рыхтуецца да адказу Брыяну ў Лізе Нацыяў. Але пакуль што канцлер Мюлер, каб ратаваць сваё становішча, калі ня ў Лізе, дык прынамсь у Нямеччыне, прыняў у сябе журналістаў, якім даў свае высьвятленьне. Канцлер заявіў, што ён — цалком у згодзе з Штрэзэманам у справе замежнай палітыкі Нямеччыны (толькі вось Мюлеру не хапае тэй дыплёматычнай штукі рабіць сабе супрацоўнікаў з сваіх найзаядлейшых ворагаў, якую мае Штрэзэман...). Што-ж датычыць справы разбраеньня роўнага для ўсіх, а ня толькі для аднэй Нямеччыны, дык у гэтым згодныя усе Немцы, як адзін.

Разбраеньне павінна ісьці ў тым напрамку, якога вымагае навет Вэрсальскі Трактат, які кажа, што разбраеньне Нямеччыны зьяўляецца першым крокам, за якім павінна наступіць разбраеньне агульнае. Кажучы аб закідах Брыяна, быццам Нямеччыны—готова да вядзеньня вайны, Мюллер даводзіў няслушнасьць і нязгоднасьць з праўдай гэтых закідаў. Ніякая вайна немагчыма цяпер церадусім таму, што ніводная дзяржава ня мае на гэтую мэту патрэбных на вайну вялізарных грошаў. Ніводны народ ня выкіне на вайну грошаў. Падрабязна даводзіў Мюлер, што Нямеччына—разброена цалком, што з 40.000 ахвіцэраў звольнена пасьля вайны 36.000, што Нямеччына мае толькі кадровую армію, прадбачаную Трактатам. Але кадравую армію маюць усе іншыя дзяржавы, што дазваляе ім скарочываць час службы ў войску. Нямецкая прамысловасьць, вядома—нарыхтавана выключна на мірную, прадукцыю. Шпаркі ўзрост нямецкай прамысловасьці і гандлёвага флёту, выкліканы вялікім прыплывам у край замежных валютаў, умагчымяць немцам хутчэйшую сплату адшкадаваньняў. У справе перагавораў аб скасаваньні акупацыі канцлер адмовіў усялякіх высьвятленьняў. На запытаньне, на якія варункі згадзіліся-б немцы—ўзамену скасаваньня акупацыі—Мюллер адказаў, што—Нямеччына ня згодзіцца ні на якія іншыя варункі кантролю, якія выходзілі-б па-за межы, прадбачаныя арт. 213 Вэрсальскага Трактату. Гэта добра ведама саюзьнікам, бо Нямеччына папярэдзіла іх аб гэтым яшчэ ў 1925 г.— пры ўваходзе Нямеччыны ў склад Лігі Нацыяў.

Арт. 213 кажа, што „Нямеччына — пакуль Вэрсальскі Трактат мае сілу—абавязана аблягчаць усялякі кантроль, які Рада Лігі прызнае большасьцю галасоў неабходным. На запытаньне, які стасунак Нямеччыны да справы злучэньня з Аўстрыяй, канцлер адказаў, што Трактат Вэрсальскі выразна ўказвае парадак, якім можа пайсьці гэта справа дый што магчымае злучэньне Аўстрыі з Нямеччынай не вымагае зьмены Вэрсальскага Трактату...

Прамова англійскага дэлегата ў Лізе Нацыяў.

З Жэнэвы даносяць, быццам нямецкая дэлегацыя страшэнна націскала на англійскую, каб яна ў прамове свайго старшыні лёрда Кушэндэна, які меў гаварыць пасьля Брыяна, каб як небудзь аслабіў фатальнае ўражаньне Брыянавай прамовы, аблягчыўшы палажэньне канцлера Мюллера. Але—з прамовы Кушэндэна неяк ня відаць, каб Англія падтрымала ў тым Нямецкую справу ў Лізе—проці Францыі. Лёрд Кушэндэн сказаў, што ён добра разумее нецярплівасьць немцаў у справе разбраеньня; немцы зьвязваюць справу разбраеньня з скасаваньнем акупацыі, але Нямеччына павінна зразумець, як цяжка ажыцьцявіць гэту задачу: З разбраеньнем трэба зьвязаць справу нацыянальнай бясьпечнасьці цэлага сьцягу краёў. Дык немцам трэба, сьціяўшы зубы, запасьціся цярплівасьцяй..,

Пасьля гэтых „пацяшэньняў“ для немцаў, англійскі дэлегат выхваляў дабрадзейны Трактат Кэллёга, які „даў людзкасьці магчымасьць з даверыем глядзець на прышлае развіцьцё палітыкі міру“.

Захапіўшы сабе паўсьвету, адабраўшы ў Нямеччыны ўсе яе калёніі, дый разброіўшы яе цалком, а сабе пакінуўшы азброенасьці да зубоў, англійцам дый іншым саюзьнікам добра „з даверыем глядзець у прышласьць“ дый выхваляць „дабрадзейства міру“...

Новая „гутарка“ Вальдэмараса.

Гданская газэта „Балтышэ Прэссэ“ зьмяшчае новую „гутарку“ Вальдэмараса. На запытаньне карэспандэнта, ці літоўская палітыка, трэбуючы Літве Вільні, лічыцца з воляй жыхароў Віленшчыны, Вальдэмарас адказаў няясна. На запытаньне, ці Вільня — літоўскае места, ці польскае, Вальдэмарас адказаў, што—ані польскае, ані, нажаль, літоўскае, але — жыдоўскае. На ўвагу, што з Вільні выйшлі — марш. Пілсудскі, а раней Міцкевіч і Славацкі, Вальдэмарас адказаў, што Міцкевіч быў літоўскі (?) паэта, толькі пісаў папольску... Што датычыць польска-літоўскага спору, дык ён можа быць вырашаны канчальна толькі на канфэрэнцыі, у якой прынялі-б учасьце Радавая Расея, Нямеччына, Польшча і Літва, як беспасрэдна заінтэрэсаваныя ў справе.

Кітай ня выбраны на новае 3-х лецьце ў Раду Лігі.

Агульны Збор Лігі Нацыяў 10-га верасьня разглядаў справу паноўнага выбару Кітаю ў Раду. У галасаваньні прымала ўчасьце 50 дзяржаваў. Паводле статуту, справа вырашаецца павышанай большасьцю ў $^2/_3$ галасоў. За прыняцьце прапазіцыі галасавала 27 сяброў Лігі, проці 23. Такім чынам Ліга правяліла кітайскае дамаганьне, падчыркнуўшы гэтым сваё раўнадушша да справы вялізарных высілкаў адроджанага Кітаю, — адмовіўшы ў такі важны мамэнт кітайскаму народу маральнага падтрыманьня...

Ці Кітай астаўся ў Радзе, як дамагаўся яго дэлегат, тэлеграма ня кажа.

Амэрыка „абмяжоўвае зброеньне.

Марскі міністар Амэрык. Штатаў Вільбэр заявіў, што ён—перакананы ў канешнай

Скандал падчас каранацыі абраза у Самбары.

За прыкладам польскага духавенства ўздумалі і ўкраінскія „владыкі“ каранаваць сваю Цудатворную Мацер Божыю ў горадзі Самбары. На дзень 25/VIII с. г. ў гэты горад прыехалі ўсе перамышльскія Япіскапы, два ўкраінскія, два польскія—сабралося некалькі тысяч народу на такую вялікую ўрачыстасьць. У нядзелю, пасьля багаслужэньня, пачаў гаварыць прапаведзь ведамы украінскі прапаведнік а. Кульчыцкі — сьвяшч. Вашчанскага прыходу. Праслаўляючы цудатворны абраз, ён даваў прыклады, калі Мацер Божыя аказвала людзям свае дабрадзействы. Гаварыў, што яму аказала яна сваю ласку, памагла жыць на сьвеце і ўказала пуцявіну, па якой ён пайшоў і цяпер гэтага не „шкадуе“. Казаў, што нейкі францускі пісьменьнік — бязбожнік, зайшоўшы ў гэту царкву і пабачыўшы абраз, — зрабіўся адразу пабожным і гарачым паклоньнікам Самбарскай Багамацеры. Як прыклад цуда, казаў што бачыў аднаго расейскага генарала (цікава, чаму не назваў яго прозьвішча?), каторы, лежучы перад абразом, маліўся і дзякаваў Багародзіцу за „цудоўнае“ ацаленьне на фроньце. Уся шынэль была падзюраўлена кулямі, але яго не закранула, дзякуючы толькі таму, што насіў на шыі падабізну цудатворнага абраза. Пасьля пачаў гаварыць пра ўкр. пісьменьніка Чайкоўскага, які быццам прыяжджае што год у Самбарскую царкву маліцца, спавядацца і прычашчацца, але „владыка“ Каціллоўскі ня даў яму дакончыць прамову, яму штось не спадабалася гутарка пра Чайкоўскага і ён, тонаючы і стукаючы са злосьці сваёй ляскай каля амбону, прыказаў Кульчыцкаму зьлесьць з амбоны. Той прасіў дазволіць гаварыць далей і абяцаў „паправіцца“, але „ўладыка“ яшчэ больш засердаваў, закрычаў на ўсю царкву і мусіць прыказаў-бы сілай сьцягнуць Кульчыцкага, але той ўступіў і зьлез з амбоны. Прапаведзь дакончыў „айцец“ Рабій, але яго ўжо слухаць амаль ніхто не хацеў: бачучы такі скандал, народ здэнэрваваны і некатарыя з абражаным рэлігійным пачуцьцем—пайшлі вон з царквы. Так і кончылася няўдачная каранацыя Самбарскай Божай Мацеры. Хоць і ня зусім удачна, але ўсе-ж такі акаранавалі. Цяпер, пасьля каранацыі, яшчэ больш пасыплецца на людзей „цудаў“ і дабрадзействаў ад Самбарскага абраза.

„Радыкальная“газ. „Українській Голос“, абгаварваючы гэты інцыдэнт, вельмі шкадуе, што Каціллоўскі гэтак нетактоўна паступіў, называе гэты выпадак трагэдыяй (ўласцівей было б камэдыяй) і паміж іншым піша:—Сельробаўшчына што дзень пашыраецца, найлепшыя нашы сьвяшчэньнікі пакладаюць усе сілы, каб народ утрымаць пры царкве. Сама каранацыя ў Самбары мела на мэце паднясеньне і папулярызацыю нашага абразу. А тут скандал! З якім пачуцьцём вярталіся дамоў верныя? Што яны гаварылі пра інцыдэнт з заслужаным „парохам“ сяла Вашчанцы, якога прапаведзі яны ня раз ужо чулі, пад якога кіраўніцтвам яны прасьвяшчаліся культурна і эканамічна? (?!)... Санацыя ў перамышльскай дыяцэзіі неабходна...

І тут „санацыя“ патрэбна. Ці памогуць толькі гэтыя навет „санацыі“, бо-ж... „сельробаўшчына, што дня пашыраецца“, а гэтага „ворага“ навет і „санацыйныя“ духоўнікі не здалеюць перамагчы.

патрэбе для Амэрыкі набудаваць у працягу 10 гадоў 70 ваенных караблёў, але—гатовы згадзіцца з парляментам, значна абмяжаваўшым гэтую лічбу—да 15 крэйсэраў і аднаго карабля-базы для самалётаў.

Але-ж—трэба думаць, што гэта толькі, так сказаць, — „першая рата“ тэй „вялікай марской праграмы“, якую апрацавала адміралiцыя Штатаў—у мэтах спыніць раз назаўсёды выключнае панаваньне Англіі на акіянах.

Камісія Лігі ў справе разбраеньня пачала працу.

11 верасьня пачала працу III (разбраенчая) камісія Лігі Нацыяў. Старшыня камісіі бэльгійскі дэлегат у сваей прамове выхваляў Трактат Кэллёга, які — „ствараe найпамысьнейшую атмасфэру“ для гутарак аб разбраеньні. Пасьля таго мін. Бэнэш, старшыня „Камітэту Бясьпечнасьці і Палюбоўных Судоў“ (падкамісія Камісіі Разбраеньня) злажыў справаздачу аб працах камітэту. Пасьля дакладу пачалася агульная дыскусія ў справе разбраеньня.

Памёр нямецкі пасол у Маскве.

Нямецкі пасол пры Радавым урадзе гр. Брокдорф-Рантцаў, які быў на адпачынку ў Бэрліне, памер 9 верасьня. Асоба нямецкага пасла ў Радах—вельмі выдатная ў нямецкай дыпляматыі, асабліва пасьля вайны. У часе Парыжскай Міравой Канфэрэнцыі гр. Брокдорф-Рантцаў быў нямецкім міністрам заграгранічных спраў. Прыехаўшы ўлетку 1919 г. у Парыж дый пазнаёміўшыся з варункамі Трактату, ён катэгарычна адмовіўся прыняць такія варункі і падаў у адстаўку. Ад таго часу гр. Брокдорф робіцца рашучым староньнікам найбліжэйшага паразуменьня Нямеччыны з СССР. Пасьля гр. Мірбаха ён займае месца пасла ў Маскве. Пры яго бліжэйшым учасьці заключаны ўсе трактаты і паразуменьні паміж Нямеччынай і Радамі, якія задуманы ім процiў неабмежаванай дыктатуры саюзьнікаў у Эўропе.

У радавай прэсе даны выраз высокай ацэнцы нямецкага дыплямата і жалю з прычыны страты гэтага прыяцеля Радавай Расеі. У колах нямецкай дыпляматыі сьмерць графа-пасла выклікала вялікае заклапатаньне: прэса сьцьвярджае, што цяжка будзе знайсьці роўнага яму заступніка на, можа, найважнейшай для Нямеччыны пляцоўцы ў Маскве.

Стасункі СССР з Захадам.

„Правда“ данесла, што з Масквы выехала камісія ўсе-саюзнай Рады Народнай Гаспадаркі — пад старшынствам кіраўніка Рады Лобова. Камісія мае задачай пазнаёміцца дакладна з станам прамысловасьці ў Эўропе і ў Амэрыканскіх Штатах, асабліва-ж зьведаць навейшыя спосабы будаўніцтва. Камісія мае таксама паразумецца з вялікімі заграгранічнымі фірмамі ў справе праектаванай разбудовы прамысловых закладаў у СССР.

Заявы Тухачэўскага (?).

Маскоўскі карэспандэнт „Кур. Варш.“ даносіць, быццам камандзір Ленінградзкага ваеннага округу ген. Тухачэўскі, у прамове да камандзіраў вайсковых часьцей, высланых на манэўры, сказаў вялікую праграмную (?) прамову, у якой, паміж іншым, заявіў, што першая вайна, якую будуць весьці Рады, будзе вайна з Польшчай. У канцы прамовы ген. Тухачэўскі выразіў пэўнасьць, што ў рэзультаце гэтай вайны чырвоная армія з трыумфам увойдзе ў Варшаву.

Абмежаваньне правоў „Г.П.У.“.

З Масквы даносяць, быццам на адным з апошніх пасе‌джаньняў „Політ-Бюро“ абгаварв. праект падпарадкаваньня „Г.П.У.“ дзяржаўнай пракуратуры. Паводле праекту ўраду СССР, „ГПУ“, будзе абавязана аб кожным арышце даносіць пракуратуры ў працягу 48 гадзін — з указаньнем прычынаў арышту. Сьледства, якое вядзецца „ГПУ“, павінна быць скончана ў працягу 2 месяцаў.

Чычэрын мае прыехаць у Парыж.

Француская прэса даведалася, быццам Чычэрын мае прыехаць у Парыж дзеля асабістых перагавораў з Пуанкарэ і Брыянам у справах радава-францускіх стасункаў. Чычэрын быццам мае ўсе патрэбныя паўнамоцтвы для канчальнага вырашэньня спрэчных спраў.

На радава-румынскім пагранiччы.

„Рабочая Газета“ даносіць, што — у зьвязку з распачатымі манэўрамі радавай арміі ў раёне Кіява — румынскі ўрад падцягнуў на граніцу з СССР 2 новых дывізіі.

Барацьба з камунізмам у-ва Францыі.

10 верасьня ў Парыжу і іншых мясцах Францыі адзначыўся вулічнымі дэманстрацыямі, як апошні дзень „агітацыйнага тыдня камун. моладзі“. У працягу тыдня ў шэрагу мясцоў адбыліся дэманстрацыі проці Трактату Кэллёга; 9 у Сан-Дэні скліканы быў вялікі мітынг, ня гледзячы на забарону паліцыі. 10 верасьня, аднак-жа, меры з боку апошняй значна перашкодзілі дэманстрантам. Арыштавана каля 40 асоб.

Вялікі працэс камуністаў у Румыніі.

11 верасьня ў Клуі распачаўся працэс проці тайных камуністычных арганізацыяў. На лаўцы падсудных 114 асобаў. Выклікана 600 сьведкаў. Акт абвінавачваньня закідае падсудным процідзяржаўную акцыю і стасунак з III Інтэрнацыяналам.

„Угодкі“ паўстаньня ў Таўрогах.

У дзень угодкаў паўстаньня ў Таўрогах, з пачыну літоўскіх сацыял-дэмакратаў, адбыліся ў Літве новыя масавыя арышты сярод недабіткаў сацыял-дэмакратыі. Сярод дзесяткаў арыштаваных — некалькі былых паслоў. Як відаць, фашызм усюды тасуе да народнага руху адну мерку.

Шпаркі ўзрост безрабоцьця ў Англіі.

Лічба зарэгістраваных беэработных у Англіі на 3 верасьня дайшла да мільёна 325.000,—амаль што на 5.000 больш, як тыдзень таму назад, дый—на 250 тысяч больш, як была ў пачатку верасьня мінулага года. Гаспадарка і палітыка рэакцыйнага ўраду даецца ў знакі работнікам і краю.

З Т-ва Бел. Школы.

✕ 18 жніўня г. г. Азярніцкім гуртком Т-ва Бел. Шк. быў наладжаны спэктакль у вёсцы Юхновічах, Міжавіцкай гміны, Слонімскага павету. Адыграна была камэдыя М. Кудзелькі „Мікітаў лапаць“. Спэктакль прайшоў добра, толькі шкада, што ў той дзень была начная навальніца і публікі было ня шмат. Білетаў прадана на 12 злотых.

✕ Гэтым-жа Гуртком ладзіўся 24 жніўня г. г. спэктакаль у мястэчку Азярніца, Слонімскага павету. Згулялі камэдыю ў 4-х актах Ф. Аляхновіча „Шчасьлівы муж“, а ў дзень 2-га верасьня г. г.—„Па рэвізіі“ камэдыю ў 1-ым акце Крапіўніцкага. Спэктаклі прайшлі добра, асабліва апошні. Даход пайшоў на пераплёт кніжак бібліятэкі.

✕ Гэты-жа гурток меў намер ладзіць спэктаталь у в. Вашкавічах, Ваўкавыскага павету, але не атрымаў дазволу ад Ваўкав. Старосты, які вымагаў розныя немагчымасьці. Што мы не рабілі, дазволу не дабіліся—вось і рабі, што хочаш. **Сябра.**

Наша хроніка.

Умястоўскі заводзіць паншчыну. Як мы даведаліся, пан Умястоўскі, рэдактар-выдавец „Беларускага Дня“, як відаць, перад зусім ужо блізкім канцом свае імпрэзы, займаецца толькі рэдукцыяй сваіх працаўнікоў. У ліпні месяцы звольніў ад працы бяз ніякага адшкадаваньня карэктара Косьцевіча, які скіраваў справу да Інспэктара Працы, дамагаючыся трохмесячнага адшкадаваньня, згодна з тым, якія існуюць звычаі і законы. Дык цяпер пан Умястоўскі, страхуючы сябе ад паўтарэньня падобных інцыдэнтаў з іншымі сваімі працаўнікамі, насупроць усякага права, пабраў ад сваіх працаўнікоў падпіскі аб тым, што ў выпадку звальненьня іх ад працы яны ня будуць дамагацца ад яго законнага адшкадаваньня. Вось, як паны „шануюць“ працу!

На беларускім сьметніку. Новы нумар „Народу“, які толькі-што вышаў, зноў прыносіць цэлы шэраг выбрыкаў, даносаў, ілжы з боку запраўднага панскага лёкая на беларускі сялянска-работніцкі рух і яго прадстаўнікоў. Як відна, дык гэта не Паўлюкевічам! Паны маюць шчасьце — сам прыехаў да іх Янка і так працуе, што і самі яны так не змаглі-б.

У наступным нумары дамо больш падрабязны адказ.

Менская прэса аб Т-ве Белар. Школы. „Dz. Wil.“ падае, што ў Менску ў сувязі з апошнімі падзеямі з Т-вам Белар. Школы ў Вільні ўся прэса востра заарэгавала. Так „Зьвезда“ піша: „Частка кіраўнікоў (?) Т-ва Белар. Школы замест зьвярнуцца да шырокіх мас беларускага працоўнага народу і разам з ім пратэставаць проціў перасьледаваньня роднай школы, роднай культуры, проціў вызваленчага руху, абы як найшырэй разьвярнуць барацьбу — знайшла больш патрэбным гнуць свой карк перад уладай.

Трусьлівая інтэлігенцыя, абіваючы панскія парогі, пакорна прыняла дырэктывы ўлады да ведама і выкананьня. Цяпер гэтыя здраднікі будуць уводзіць „санацыю“ ў масавай культурна-асьветнай пераважна сялянскай арганізацыі Т-ва Белар. Школы, будуць разьбіваць актыўнейшыя кадры арганізацыі і народны рух зварачваць ад клясавай барацьбы.

Польскі ўрад, навучаны разгонам „Грамады“, і відзячы, што кожны падобны ўдар выклікае рэакцыю, наступіў цяпер па-езуіцку, з падходамі.

Але дарэмны „стараньні“.

Далей „Dz. Wil.“ дадае ад сябе, што выбраная ўрадам дарога наўсродкаў не праводзіць да мэты.

А мо‘ на гэты раз орган „служкаў божых“ мае слушнасьць.

Арыштаваньне б. вучня Бел. Гімназіі. Польскія віленскія газэты падаюць, што некалькі дзён таму назад на польска-радавай граніцы арыштаваны б. вуч. Віленскай Бел. Гімназіі В. З. (поўнага імя і прозьвішча не высьняюць). Пішуць, быццам пры ім знойдзена многа „kompromitujących“ дакумэнтаў. У гэтай справе вядзецца цяпер сьледзтва і, пэўне-ж, ведамае беларусам „badanie“.

І віленскія жабракі мусяць мець патэнт. Адміністрацыйныя ўлады маюцца хутка выдаць распараджэньне, якім вулічныя музыканты і фокусьнікі будуць змушаны рэгістравацца і, пэўне, плаціць хоць невялікі падатак.

Як ведама, гэтыя фокусьнікі і музыканты зьбіраюць дабравольныя ахвяры, тое, што добрай душы чалавек выкіне праз вакно. Для іх таксама маюцца быць устаноўленымі гадзіны „працы“, іх песьні і музыкальныя „творы“ будуць кантраляваццa адпаведнымі ўладамі. Відаць, баяцца, каб бедныя фокусьнікі занадта не перапрацаваліся і каб, чаго добрага, не разносілі-б „камуністычную“ заразу. А каб не мазолілі яснепанскія вушы сваімі песьнямі і музыкай, ім будзе забаронены ўваход у тое падворка, дзе на браме прыбіта афішка—„grajkom i śpiewakom wejście zabronione“.

Як відаць, дык і сярод жабракоў паўнейшая „санацыя“ праводзіцца.

Контр-рэвалюцыянэры ўцякаюць. У раёне Пудахоўшчыны недалёка ад мяст. Зубовічы перайшлі на гэты бок кардону два савецкія афіцэры, якія кажуць, што яны служылі ў 5-м конным артылерыйскім палку і ўцяклі адтуль таму, што Г. П. У. даведалася аб контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, да якой і яны належалі.

Перагляд справы Балінавай — жонкі б. пасла. 12./IX. Віленскі Апэляцыйны Суд разглядаў справу Зінаіды Балінавай, жонкі бышага пасла „N. P. Ch. і Вольгі з Язэпам Разумовічаў, якія абвінавачваліся ў шпіянажы. Як ведама, жонку Баліна, пасьля таго, як ён уцёк заграніцу і напэўна, каб памсьціцца за гэта, яшчэ ў мінулым годзе арыштавалі і зрабіўшы працэс, укінулі з маленькім, яшчэ месячным дзяцёнкам, у вастрог. Балін з заграніцы прыслаў пратэст проціў гэтага гвалту і на імя Пілсудскага прапазыку, каб жонку выпусьцілі хоць пад самы найбольшы залог. У скорасьці адбылася судовая расправа ў Акружным Судзе, які прызнаў Балінаву віноўнай і асудзіў на 3 гады вастрогу, але яна злажыла апэляцыю і пад залог 20 тысячаў была выпушчана на волю. Справа Балінавай аснована на тым, быццам яна нагавораная Клімантовічам, змушала свайго мужа (?!) пачаць шпіёнскую працу, але Балін на гэта не згадзіўся, як падае віленскае „Słowo“, ня веручы Клімантовічу.

Перагляд гэтай справы адбыўся пры зачыненых дзьвярох, але ў рэзультаце Апэляцыйны Суд прызнаў Балінаву ня віноўнай, а ў адносінах да Разумовічаў—зацьвердзіў прыгавор Акружнога Суду.

Прызнаў ня віноўнай, але сколькі гэту ня віноўную намучылі і нацягалі па вастрогах, сколькі гэта ёй каштавала здароўя?

Спрытны злодзей. Два месяцы таму назад, паміж іншымі, выпусьцілі з вастрогу і вядомага злодзея Дрэку. На другі дзень ён забраўся ў сьпіжарню Стэфанаўскага вастрогу і ўкраў 100 кілягр. саланіны. Паліцыя дагадалася чыіх рук гэта справа, бо-ж Дрэка сядзеў у гэтым самым Стэфанаўскім вастрозе, і злавіла яго на вул. Пілсудскага. Аднак, Дрэку ўдалося вырвацца, хоць адзін з паліцыянтаў і ўдарыў яго шабляй па галаве. Праз два дні яго абкружыла густым кальцом паліцыя ў бурбіскім лесе, але, ня гледзячы на страляніну, ён і гэты раз уцёк. І яшчэ разы тры ці чатыры ён вырываўся з рук паліцыі, то скакаючы праз плот, адзін раз навет з другога паверху, ажна ў канцы паліцыя моцна раззлавалася і пачала лічыць справай свайго гонару злавіць у-ва што-б ня стала гэтага лаўкача. Аднаму вывядоўцу, нарэшце, удалося такі ў Францішканскіх мурах злавіць Дрэку і ён быў прыведзены ў цэнтральны арышт. Тут сьмелы зладзей адразу заявіў, што адсюль уцячэ. Такога небясьпечнага гасьця, ведама-ж, пасадзілі ў адзіночку і строга пільнавалі.

Уночы Дрэка стаў крычаць, што яму баліць жывот і патрэбаваў, каб яго вывелі на падворка.

Выйшаўшы на двор, бандыт так моцна ўдарыў стражніка, што той паваліўся на зямлю, а яго і сьлед прастыў. Вырваўся ён, як потым аказалася, праз дзюрку ў муры, дзе работнікі правадзілі вадасточныя трубы.

Зноў будзе працы для паліцыі.

Арышты камуністаў. На днях паліцыя зьліквідавала некалькі камітэтаў і падкамітэтаў Камуністычнай Партыі Заходн. Беларусі ў паветах Баранавіцкім і Стаўпецкім. Знойдзена пры гэтым шмат камуністычнай літэратуры. Усяго арыштавана 20-ць чалавек.

Арыштаваньне пераводчыка. У раёне Стоўпцаў паліцыя арыштавала і ўжо адвязла на Лукішкі, як падае „Słowo“, быўшага сэкрэтара Беларускай Рады ў Вільні гр. К. (поўнага прозьвішча не падае), які быццам пераводзіў праз граніцу агентаў Г.П.У. з Менску.

Характэрна, што буржуазныя газэты ўсялякае здарэньне стараюцца выкарыстаць дзеля кампрамітацыі беларускага руху, пішучы, замест проста К. ці В. З., якімі яны і зьяўляюцца ў сапраўднасьці, абавязкова б. сэкрэтара Белар. Рады, б. вучня Белар. Гімназіі і г. д.

Травяць, цкуюць уладу, каб, знача, пазачыняла гімназіі, нашы ўстановы, бо-ж бачыце, якія адтуль выходзяць праступнікі!

Стараюцца гэтым даказаць, што ўсе беларусы зьяўляюцца „антыпанствоўцамі“, „вывратоўцамі“, „камуністымі“, якім толькі і месца на Лукішках!

Шчасьце наша, што ўсе беларусы туды ня тоўпяцца, а то паны з віленскага Слова усіх, што да аднаго, туды пасадзілі-б. Хочацца ім!

Застрэлілі камуністага. У панядзелак 11./IX. у раёне Стоўпцы стараўся перайсьці на той бок кардону невядомы чалавек. Калі яго хацела затрымаць пагранічная польская ахрана, дык на окрык ахраны „стой“ уцякаючы не затрымаўся, раздаліся стрэлы і ён паў трупам. Забіты аказаўся вядомым камуністам на прозьвішчу В. Адзэркі.

Наш уладар.

Гэй ўзьляці маё імкненьне
Панад родным, над прасторам,
Струнаў шчасьця пераборам
Загрымі ў палёх, над борам—
Зьдзейсьні сэрца латуценьні.
Гэй ўзьляці маё імкненьне!

Шлях агнём твой хай іскрыцца,
Усьміхнецца сонца раньня.
Тонам заклiку к змаганьню
Хай напоіць усё дазваньня.
Скрозь шум громаў, навальніцаў
Шлях агнём твой хай іскрыцца.

Брацьця!—хто ўладар над намі?
— Распалі пякучым болем
Маё цела, дух мой болей
Ты ўзмацніш прагненьнем волі,
Сьветазарнымі агнямі...
Брацьця, хто-ж ўладар над намі?!

Дух змаганьня непакорны,
Сымбаль працы, волі зыкі—
Наш ўладар сьвяты, вялікі...
Грайце-ж гімн яму музыкі,
Зьнішчыць дзень нядолі чорны,
Дух змаганьня непакорны.

М. Васілёк.

„Porwany“ польскі жаўнер. Абшарніцкая газэта „Słowo“ падае, што ў раёне Халмоў 15./IX. радавая пагранічная стража ў „таямнічы“ і яшчэ ня высьнены спосаб перацягнула на свой бок жаўнера КОР — Вішнеўскага.

Перарваньне тэлефанічнай лініі. „Kur. Wil.“ з дня 12./IX. падае наступную вестку. „На днях няведамыя асобы перарвалі дроты на вайсковай тэлефанічнай лініі ў ваколіцы Чорнага Бору, Міцкуньскай вол., а гэтым самым лучнасьць паміж Х. палком і штабам дывізіі. Думаючы, што гэта сталася прыпадкова, лінію зрамантавалі і ўзнавілі лучнасьць. Па пэўным часе зноў лінія была папсавана. Паноўная паправа дала той-жа вынік,—чыясь рука зноў перарвала дрот. Такім спосабам у працягу аднаго дня ў таямнічы спосаб чатыры разы была ўстрымана лучнасьць паміж Х. палком і дывізіяй. Сьледчыя ўлады вядуць у гэтай справе энэргічнае сьледзтва“.

Пажары ў Лідчыне. Манархістычнае „Słowo“ з дня 14-IX падае наступнае: „Лідзкі павет у працягу двух лет слыве пастаяннымі пажарамі, бяручы з гэтага боку рэкорд у-ва ўсей Польшчы, аб чым мы паведамлялі некалькі разоў, зьвяртаючы ўвагу на пэўную сувязь паміж узмоцненай працай Грамады, а ўсьцяж паўтараючыміся пажарамі. Паліліся цэлыя вёскі і навет мястэчкі. Змучаныя жыхары адпачнулі толькі пасьля ліквідацыі Грамады і ўскорасьці пасьля гэтага (месяц таму назад — Рэд.) шайкі падпалячаў „зялезная рука“ (Шайку грабіцеляў і „Грамаду“ адным аршынам панкі мераць!—Рэд.). Цяпер пасьля паўтарагадовага перарыву ў Лідзкім павеце ізноў гарыць. 12-га верасьня ў маёнтку Упехоўшчына — пані Марачэўскай, згарэлі: стайня, гумно са збожжам і абора, у якой знаходзілася і згінула 28 штук заводнага быдла. Страты выносяць каля 100 тысяч злотых. 13-IX у маёнтку Раманаўцах, Лябёдзкай воласьці — сэнатара Ваньковіча згарэла гумно са збожжам і паравая малацілка. Страты выносяць каля 150 тыс. зл. Ёсьць падазрэньне, што ў абодвух выпадках пажар паўстаў ад падпаленьня. Мусім адзначыць, што Раманаўцы сэнатара Валькoвіча былі ўжо падпалены год таму назад“.

На каго-ж цяпер зваляць бяду манархісты? Шкода, што „Грамады“ няма — пайшло-б гэта на ейны рахунак.

Сяляне сякуць лес. Як інфармуе варшаўская газэта „Rzeczpospolita“ з дня 13/IX, у раёне Стахоўшчыны, недалёка ад польска-радавай граніцы сяляне з вёскі Дзеворкаў, вядома-ж, падбураныя „komunistycznemi“ агітатарамі, з піламі і тапарамі паехалі ў лес Гэнрыка Завістоўскага ўласьніка маёнткаў Дзяворцы і Язьміны і пачалі сярод белага дня сеч і вывазіць дрэва.

Выкліканая абшарнікам паліцыя пачала разганяць сялян, але гэта мала памагло, а толькі азлобіла сялян. Двое з іх—Вацлаў Валянчук і Янка Іванчук кінуліся на лясьніка і паліцыю з сякерамі і, быццам, ранілі іх галовы. Тады паліцыянт выстраліў і раніў Іванчука ў грудзі. Натоўп сялян у той момант кінуўся на паліцыю і лясьнікоў, аднак, ім усё-ж такі ўдалося разагнаць „бунтаўнікоў“. Некалькі чалавек арыштавана.

Калі гэта ўсё праўда, дык вельмі дзіўна, чаму віленская прэса маўчыць аб гэтым?

Паветраныя катастрофы. 6-га верасьня г. г. на лётніску ў Маладэчне зьляцеў самалёт пад назовам „Opad“, пры чым апарат разьбіўся, лётнікі ў безнадзейным стане перавезены ў віленскі вайсковы шпіталь. Адзін з іх ускорасьці памёр.

Некалькі дзён назад зьляцеў і другі на лётніску ў Дзенцёле, каля Наваградка. Зараз пасьля ўзлёту ў паветра ад ня высьненых яшчэ прычын паляцеў на зямлю. Лётнік цяжка ранены. На месца выпадку прыехала спэцыяльная вайсковая камісія.

Ці падалі Вы ужо дэклярацыі на беларускую школу? Як ідзе у Вас справа дэклярацыяў? Пішэце у газэту і канцэлярыю Гал. Управы Т-ва Беларускае Школы.

З жыцьця Горадні.

× **Бясплатны тэатр для беларусаў.** Гарадзенскі магістрат мае свой уласны мястовы тэатр, які лічыцца па будове адным з найлепшых тэатраў у Заходняй Беларусі дый вось гэты тэатр ён аддаў у арэнду нейкаму дырэктару трупы Ярашынскаму на год часу. Перад тым, як яго аддаць у арэнду, быў апрацаваны вызначаным прызыдыумам магістрата праўнікам праект ўмовы, які павінен быў быць прачытаны на жаданьне мястовай Рады дзеля зацьверджаньня,—дык перад тым, як яшчэ мелася разглядацца гэтая справа на Радзе, яна разглядалася на паасобных фракцыях, што твораць весь гэтую Раду.

Напярададні паседжаньня радны беларус Зьмітрук Кулакоўскі, які знаходзіцца пад палітычным сьледзтвам, таксама атрымаў запрошаньне на гэтае паседжаньне, хаця, згодна з існуючым распараджэньнем ген. Асмалоўскага, ён да часу закончэньня справы ня можа быць прысутным на паседжаньні Рады, але ўсё-ж-такі зьявіўся на паседжаньне сацыялістычнай фракцыі выслухаць праект гэтай умовы і паглядзець, як „сацыялісты“ будуць трактаваць гэтую справу. У гэтым праекце, апрача грашавой умовы з дырэктарам, быў пункт, дзе гаварылася, што для польскіх культурна-просьветных арганізацыяў дырэктар павінен даваць колькінаццаць разоў тэатр бясплатна, а для беларусаў... для беларусаў нічагусенькі. Выслухаўшы вось гэтую ўмову і бачачы, што, апрача польскай нацыянальнасьці, больш ніякай не даюць бясплатна тэатру, Кулакоўскі ад імя беларускага насельніцтва ўнёс дадатак да гэтага пункту ўмовы, каб і беларускім культурна-асьветным арганізацыям, як Т. Б. Ш., далі 12 разоў у год бясплатна тэатр для пастаноўкі п‘ес, а таксама і для работніцкіх прафэсіянальных арганізацыяў. Трэба пры гэтым дадаць, што калі Кулакоўскі ўнёс вышэйпаданае дапаўненьне, — некаторыя з ППС правіцы зьдзівіліся і, удаючы быццам ня ведаюць, што ў Горадні існуе беларуская культурна-асьветная арганізацыя Т. Б. Ш., кажучы: „a ci tu są jakie białoruskie organizacje?“, хоць самыя гэта добра ведаюць, бо ня раз былі на беларускіх спэктаклях. Тады Кулакоўскі даказаў, што такая існуе і яшчэ раз папрасіў, каб на паседжаньні Рады была ўнесена яго папраўка (трэба адмеціць, што ў нас у Горадні ў сацыялістычную фракцыю ўваходзяць дзеля большасьці прадстаўнікі работнікаў з рознымі палітычнымі поглядамі, бо асобную фракцыю ня могуць стварыць дзеля таго, што лепшыя прадстаўнікі ад работнікаў, якія-б маглі кіраваць асобнай ад „сацыялістых“ фракцыяй, пазбаўлены пакуль што права весьці працу на тэрэне Рады, бо знаходзяцца пад сьледзтвам).

Дапаўненьне да праекту ўмовы адносна адпушчэньня бясплатна тэатру 12 разоў у год для беларускай культурна-асьветнай арганізацыі і для работніцкіх прафсаюзаў толькі на трэцім паседжаньні Рады 11-га верасьня г. г. на галасаваньні большасьцяй галасоў была прынята і ўпісана, як асобны пункт, так што цяпер Т-ву Б. Ш. у Горадні трэба ўзяцца за працу і выкарыстаць гэта, як належыць.

× **Падбаўка работнікам.** Гарадзкія работнікі, што працуюць ад магістрату пры развбудове Горадні, уваходзячыя ў саюз будаўляных работнікаў, з 1-га верасьня г. г. атрымалі падбаўку 70 гр. у дзень.

× **Выбары ў Касу Хворых.** Гарадзенская прэса, ад санацыйнай да сэнсацыйнай, падае вестку, быццам 16 сьнежня г. г. нарэшце маюць адбыцца выбары да Рады Касы Хворых. Добрая рэч, калі ня будзе перашкоды з боку асоб з-пад знака Войтка Маліноўскага, як гэта было раней у 1927 г., калі, дзякуючы супрацоўнікам Войтка 2 разы выбары былі ўняважнены, бо ў Раду Касы Хворых прыбыло шмат радыкальных элемэнтаў.

× **Спэктакль-вечарына.** 22 верасьня с. г. Гурток Т-ва Б. Ш. у м. Горадні ў салі бышага клюбу жыдоўскіх акадэмікаў, Замкавая вул. 5, ладзіць спэктакль-вечарыну. Будзе пастаўлена драма ў 2-х актах Фр. Аляхновіча „Дзядзька Якуб“. Пасьля драмы будзе дэклямацыя беларускіх вершаў і ўрэшце скокі да раніцы пад гукі духавога аркестру.

× **Адведзены Горадзенскага Павятовага Старасты на гмінах.** Дня 17./VII. у гміну Берштык прыехаў Стараста Горадзенскага павету, П. Робакевіч, з прычыны наданьня прысягі новавыбраным і адміністратыўна-назначаным солтысам, аднача́сна выслухаць, як казаў, „болёнчкі людпасьці“. У памешканьні школы сабралася, апрача ўрадоўцаў, шмат сялян. Цікава было заўважыць абарваных беднякоў, якія, пэўна, прыйшлі з скаргай на вялікія падаткі і агулам на сваё гаротнае жыцьцё. Пасьля прысягі Стараста раздаў мэталёвыя „Orły“ новым солтысам і пажадаў ад іх лёяльнай працы на карысьць паньства. Пасьля Стараста зазначыў, што ня мае з кім шчыра пагаварыць аб гміннай гаспадарцы, бо з ліку радных мала ёсьць сталых людзей, а ўсё больш „смаркачы“. Далей ён сказаў да людпасьці сваю доўгую, „грозную“ прамову, у якой зьняважыў прадстаўнікоў беларускага культурна-нацыянальнага адраджэньня, абзываючы іх камуністамі. А балячак народу Стараста навет не дакрануўся і сяляне пайшлі дамоў з нічым. Нарэшце гэты панок паехаў, зрабіўшы загад гміннай радзе выбраць новага войта, бо стары звольнены. Радныя выбіралі ўжо два разы, — Стараста не зацьвярджаў, а выслаў камісара на места войта, пасьля — бугальтэра, другога памочніка пісара, а нарэшце—сэквэстратара. Перад гэтым яны зрабілі пераварот у гміннай радзе: трох радных завесілі і звольнілі войта, Міхася Косьцевіча, шчырага беларуса-адраджэнца. Дык радуйцеся, сяляне! Бачыце: „дабрабыт“ расьце! Цяпер падаткі напэўна ўзрастуць, бо кожны з гэтых панкоў будзе „urzędować“ на крывавую сялянскую залатоўку. Вось, як выглядае жыцьцё Берштаўскай гміны!

Карэспандэнцыі.

Сьвядомасьць расьце.

У суботу, 4-га жніўня, Баранавіцкім гуртком Т-ва Бел. Школы была наладжана спэктакль-вечарына. Згуляна была пе‘са Я. Купалы „Паўлінка“. Паводле апініі тутэйшай крытыкі, „Паўлінка“ спраўляла добрае ўражаньне — найлепшае з усіх дагэтуль стаўленых у Баранавічах спэктакляў.

Асаблівую ўвагу зьвяртала на сябе аматарка Паўліна Круцько ў ролі Паўлінкі. Мастацкае выкананьне ролі выклікала часта слушныя воплескі публікі. Трэба пажадаць, каб Паўліна Круцько й далей не пакідала беларускай сцэны.

Трэба адзначыць яшчэ гр. Ганевіча Мікалая ў ролі Пустарэвіча, які даў запраўдны тып шляхціца, з ўсім яго камізмам.

Ня гледзячы на тое, што ў гэтым самым дню ў Баранавічах адбыліся яшчэ дзьве вечарыны ў „Polskiej Macierzy Szkolnej“ і „Sokole“, на беларускую вечарыну зьявілася столькі публікі, як ніколі перад гэтым. Беларуская сцэна робіць вельмі добрае ўражаньне на баранавіцкую публіку і навет, калі самыя аматары забыліся свае ролі, можна пачуць яшчэ і цяпер на вуліцы прыказкі „каханенькія—родненькія“, „сюдэма—тудэма“, „собсьцьвенна вось-це-да“ і г. д.

Пры Баранавіцкім гуртку Т-ва Белар. Школы з‘арганізавалася музычальная сэкцыя, куды ўвайшлі паважныя сілы. Як ведама, хутка адбудзецца першы канцэрт нашых музыкантаў. Агульным сабраньнем Баранавіцкага гуртка Т-ва Бел. Школы пакліканa да жыцьця спартыўная сэкцыя. Першым заданьнем сэкцыі будзе арганізацыя Беларускай Футбольнай Каманды ў Баранавічах. Вітаем!

Віктар Шаг.

Сярмяжніку ўсюды вязець.

У в. Дзехцяры Браслаўскай гм., у гэтым месяцы, на начлезе праляцела куля і забіла сьпячага вартаўніка. Вось ня ведама адкуль і зашто ды бяда. Мо‘ яго „грэх“ пакараў за тое, што належаў калісь да „грэшнай „Грамады“?

Горкі.

„Ora et labora“.

14-VIII прыкаціў да нас Браслаўя на стараставым аўтамабілі „Владыка“ (архірэй), які рабіў тут па нашых паветах малебен. Маліўся і „вучыў“, што ня трэба падаць духам, што на палёх усё прапала і што ня будзе цэлую зімачку сялянам чаго есьці, а трэба толькі працаваць ды як найбольш маліцца, бо „Господзь Вог міласьціў“. Далей „Сьвяты“ Владыка сказаў, што і тое, што Расея страчана, не павінна быць нікому фатальна, бо для шчырых праваслаўных, пака „азарыцца“ Усход., Польшча зусім можа яе заступіць і быць для іх „другой Родзінай“. Няхай гэтак будзе!... Пераначаваўшы ў Парсьце — „дарагі“ госьць на лёгкім аўтамабіле, са сьвістам паплыў у кірунку Чэрэд.

Горкі.

Кулак падсмаліўся.

У засьц. Мяцелях, Нова-Пагост. гміны, жывець адзін багаты гаспадар ды і надта адважны, але за тое трохі скупенькі (а скупы ўтрое траціць). 23-VIII прыйшла да яго нейкая жабрачка, якую адны лічаць за жабрачку, другія — за вар‘ятку, а іншыя зусім за чараўніцу, і прасіла ў яго на беднасьці. Ня трэба гаварыць, што нічога ён ня даў ды яшчэ некалькі разоў пераехаў ёй мятлой „без пардону“.

За гэтакі канфуз і гэтакую зьнявагу Натальля (гэтак яе завуць) рашыла „рэагаваць“, і сярод белага дня пашла і падпаліла яго. Вецер быў пры гэтым падняўшыся такі, што адразу агонь сваімі языкамі ахапіў усе будынкі гэтак, што нічога і ўратаваць не пасьпеў.

Характэрна, што калі ў запрошлым і ў леташнім годзе гарэла в. Стара-Пагост (раз 26 хат, а другі раз каля 20 хат) ды людзі праз цэлую восень спалі пад голым небам пры возерным берагу, як жыды „На рэках Вавілонскіх“.

Ніхто тады і ня піснуў, нібы ўсе анямелі, а цяпер, як ахвярай стаў сам Кулак, дык падняўся гэтакі гоман тут (навет з амбоны аб гэтым гутараць), што хоць ты ўцякай хоць за 30 палёў.

Не дарма кажуць: „багатаму дык і сам чорт дзяцей калыша“.

Няпрытульны.

„Самаўрад“.

(Міжавіцкая гміна, Слонімскага пав.).

У Міжавіцкай гміне самаўрад заваёваны працоўнымі. Гэта дало доступ беднаце да гміны, бо ў мінулыя часы гміна для яе была амаль што недаступная. Аднак вядома, што пры капіталізьме значыць самаўрад. Ен існуе толькі для вока. Гэта было падчыркнена і ў нас.

На адным з паседжаньняў гміннай рады была ўхвалена грашавая дапамога Беларускім Гімназіям у колькасьці 600 зл. Перш-на-перш Староста скасаваў палову. З пазастаўшайся сумы гмінная рада назначыла 250 зл. В. Б. Г., а рэшту, 50 зл.. Н. Б. Г., кіруючыся тым, што ў той час з Міжавіцкай гміны вучылася 5-цёх вучняў у В. Б. Г. і адна вучаніца ў Н. Б. Г. Але вось на прадвесьні новага школьнага году, калі меліся быць высланы грошы ў мейсца назначэньня, гэтая самая ўлада скасавала ізноў грошы асыгнаваньня В. Б. Г., пакідаючы толькі 50 зл. Н. Б. Г. Цікава што гэта значыць?

Няўжо-ж мы ня маем права кіраваць сваймі крывавымі грашмі? Але, вядомая рэч: каб гэтая сума была асыгнавана на „Strzelców“ або другую арганізацыю такога тыпу, то былі-б зацьверджаны. Гэты факт хай служыць доказам, што пры сучасным ладзе працоўныя праз самаўрад нічога здабыць ня змогуць.

Парнасец.

З Радавае Беларусі.

Рознае.

— Горацкае Навуковае Т-ва надрукавала 5 том сваіх прац, якія ў далейшым будуць выходзіць пад рэдакцыяй старшыні Т-ва Кісьлянова.

— Беларуская Дзяржаўная Бібліятэка на ўзгадненьні з Інстытутам Леніна ў Маскве выдае ў якасьці дадатку да вядомае бібліографіі па расейскай літэратуры, якая датычыць Леніна, „Лєнініяна“—ленінскую бібліографію за 1917—1927 год.

— Беларускаму Дзяржаўн. Выдавецтву зданы для выдрукаваньня новыя дзіцячыя кніжкі: Л. Чарняўская „Сябры“—апавяданьне; Юр. Будзяк „Бусел цыбаты“ — апавяданьне; Джэк Лёндан „Аляскі сабака воўк“ — апавяданьне; Андр. Александровіч—„Рыбак“—апав.; Зьмітрук Бядуля „Залатая лісічка“ і „Гаспадарка“—казкі; М. Грамыка перапрацоўка казкі Пушкіна пра рыбака і рыбку і іншыя.

— Для надрукаваньня ў Белар. Дзяржаўнае Выдавецтва зданы новыя п‘есы, між імі Я. Гладкага „Вясельле і суд“.

— Выдавецкая камісія сэкцыі навуковых працаўнікоў рыхтуе да друку наступныя кнігі: проф. Ленца „Рэфлексолёгія“, праф. Іваноўскага, „Мэтодолёгія“ і прыродазнаўства“, асыстэнта Гайвароўскага „Псыхтэхніка і паліт-асьвет-работа“, доцэнта Выдры „Фармальна-сацыялягічная школа“ і іншыя.

— Белар. Дзярж. Выдавецтва друкуе другі том збору твораў Янкі Купалы.

— Бібліяграфічная камісія І. Б. К., супольна з Дзяржаўнай Бібліятэкай, праводзіць бібліяграфаваньне друку ўсей Беларусі. Камісія ў 1927 годзе выдала 4-ты том „Матар‘ялаў для беларускай бібліяграфіі“. Падрыхтаваны да друку том І „Прырода і вытворчыя сілы“ і выпускаецца ІІ том „Археолёгіі“.

Наступныя томы: „Народная гаспадарка“, „Палітычнае жыцьцё“, „Мастацтва“, „Мова і літэратура“, „Гісторыя і археолёгія“, маюць быць выданы ў працягу бліжэйшых двох год.

Апісаньне бягучага друку праводзіцца Беларускай Кніжнай Палатай, якая выдае „Летапіс беларускага друку“.

Асобная камісія пры Дзяржаўнай Бібліятэцы намеціла скласьці бібліяграфічны экскурсыйны дараднік для краязнаўцаў, у які ўключаецца да 2.500 асноўных неабходных назоваў.

— Цэнтральная Бібліятэка краязнаўства склала бібліяграфію беларускага краязнаўства, куды ўваходзіць да 4.000 назоваў, яна складаецца з 4 аддзелаў. Бібліяграфаваньне краязнаўчай літэратуры на мясцох праводзіцца ў Магілёве і Віцебску акруговымі краязнаўчымі таварыствамі.

— Белар. Дзяржаўнае Выдавецтва прыступіла да выданьня твораў Леніна. Усе творы будуць укладзены ў 12 томаў, кожны ў сярэднім па 25 аркушоў. Ужо перакладзена каля 150 аркушоў на беларускую мову.

Дагэтуль Белар. Дзяржаўнае Выдавецтва выдала (ў белар. мове) 14 твораў Леніна.

—Вышла ў сьвет 1-ая частка матар‘ялаў для вывучэньня фальклёру і мовы Віцебшчыны А. Шлюбскага. Кніга зьмяшчае народныя забабоны і замовы і некаторыя з песень.

— Археолёгічная камісія І. Б. К. здала ў друк археолёгічны зборнік разьмерам да 20 аркушаў. У зборніку будуць зьмешчаны артыкулы аб розных археолёгічных экспэдыцыях І. Б. К., наладжаных у 1926—27 годзе, а таксама матэрыялы аб палеалітычнай стаянцы ў Бэрдыжы, Бянцараўскім гарадзішчы, археолёгічных выпадках каля м. Турава. Усе артыкулы ілюструюцца адпаведнымі малюнкамі і чарцяжамі.

— Белар. Дзяржаўны Музэй набыў новую карціну ад мастака Воўкава — пэйзаж „Заходняя Дзьвіна“, якая зьяўляецца аднэй з найлепшых прац Воўкава.

— „Маладняк“ запрашае ў Менск прадстаўнікоў Б.А.П.П.А. (Усесаюзнай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікаў) для наладжаньня лекцый і дакладу аб стане пралетарскай літэратуры.

— У Віцебскім архіве ў сувязі з распрацоўкай пытаньня аб паўстаньні 1863 году польсэкрэтар І. Б. К. знайшоў першы нумар часапісі „Свобода“, якая выдавалася „Обществам Земля и Воля“.

Гэта надзвычайна рэдкі дакумант, два экзэмпляры якога захаваліся толькі ў Брытанскім Музэі ў Лёндане.

— Па запрашэньню аб‘яднаньня пісьменьнікаў „Полымя“ і Беларускага Т-ва Культурнай Сувязі з замежамі 14 траўня г. г. прыяджалі ў Менск выдатнейшыя ўкраінскія пісьменьнікі: Павал Тычы, Паўро Панч, Сасюра, Пілікака, Сэмэнка і іншыя.

— Селянін (в. Скварцы, Кайданоўскага раёну) Каст. Вашыка сабраў 2950 слоў, 12 дзіцячых, 50 вясьняцкіх, 6 купальных, 3 вясеньных і 6 жніўных песьняў; 4 замовы, 300 прыказак і шмат іншых матэр‘ялаў.

— Бібліяграфічны аддзел М. А. І. выпускае ў бліжэйшым часе „Штогоднік аграрнай літэратуры СССР за 1926 год“. У далейшым „Штогоднік“ будзе выхадзіць рэгулярна за кожны мінулы год. Зьмест „Штогодніка“ за 1926 г. падзяляецца на 2 томы: 1. Эканоміка сельскай гаспадаркі, 2. Сялянскае і аграрнае пытаньне. Матэр‘ял „Штогодніка“ складаўся больш чым з $34^1/_2$ тысяч кніг і брашур і 13 тысяч артыкулаў, рэцэнзій і статыстычных табліц.

— У красавіку пры АПА КККПБ адбылася нарада навуковых працаўнікаў-марксыстых па пытаньні аб арганізацыі ўсебеларускага таварыства марксыстых.

Нарада прызнала патрэбным арганізаваць у Менску Усебеларускае Т-ва марксыстых. Апрача гэтага, даручана існуючаму бюро Т-ва гісторыкаў-марксыстаў склікаць агульны сход марксыстых для арганізацыі Т-ва марксыстых у складзе 3-х сэкцый: гістарычнай, эканамічнай і філёзофска-сацыялёгічнай.

— Гістарычная камісія польсэктару сумесна з катэдрай гісторыі беларускай мовы выдае цікавыя матэрыялы пад назвой: „Беларускі рэвалюцыйны і контр-рэвалюцыйны друк у часе паўстаньня 1863 году“.

Дакуманты па гэтым пытаньні да апошняга часу зусім ня былі ведамы, як, напр. „Гутарка двух суседзяў № 4“.

Выданьне абхоплівае сабою матэрыялы пра рэакцыйную дзейнасьць Мураўёва на Беларусі.

— Праводзіцца абсталяваньне Менскага гістарычнага архіву, якое мае быць у хуткім часе закончана. У гэтым архіве знаходзяцца ўсе матэр‘ялы Віцебскага губэрнатара з часоў сялянскага рух у 1863 годзе і інш.

— Бел. Дзярж. Музэй у наступным годзе мае арганізаваць майстроўню для выпрацоўкі машонкаў, статуэтак і інш. рэчаў, як адбіткаў з розных каштоўных экспонатаў, што захоўваюцца ў БДМ, гэта дасьць магчымасьць назнаёміць з мастацкімі каштоўнасьцямі музэю самыя глухія куткі БССР.

— Гістарычная кляса ІБК здала ў друк другі том беларускага архіву прац археолёгічнай камісіі. Гэты зборнік матэрыялаў зьяўляецца 16 томам літоўскае мэтрыкі: „Кніга запісаў“ і характарызуе сабою праўнае становішча Віцебшчыны і Полаччыны ў Літоўска-Беларускі перыяд.

Зборнік зьяўляецца надзвычайна каштоўным укладам для высьвятленьня мінулага старажытнае Беларусі.

— Заснаваная ў 1922 годзе тэрміналёгічная камісія (цяпер Інстытут Навуковай Мовы) за час сваей працы канчаткова апрацавала 35,663 тэрмінаў-слоў, з якіх 27,316 надрукаваны ў 15 выпусках навуковай тэрміналёгіі, а 8,357 знаходзіцца ў друку. Апрача гэтага, вайсковай камісіяй пры Інбелкульце выданы слоўнік вайсковай тэрміналёгіі каля 10 тысяч слоў.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўнівае ей існаваньне.

Рэдактар-Выдавец: М. Масьцерко.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.